ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
"ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ ІМЯ К. КРАПІВЫ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ"

**УДК 398.3:392.5 (476)**

**ІЗОТАВА Вольга Вітальеўна**

# СІМВОЛІКА ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДАВА-ПАЭТЫЧНАГА КОМПЛЕКСУ БЕЛАРУСАЎ

10.01.09. – фалькларыстыка

**АЎТАРЭФЕРАТ**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П. М. Машэрава"
БІБЛІЯТЭКА

**Мінск – 2006**

Навукова-
бібліяграфічны
аддзел

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў аддзеле фалькл...
"Інстытут мастацтвазнаўства, этна...
Беларусі"

Навуковыя кіраўнікі

доктар філалагічных навук,
прафесар А.С.Фядосік

доктар філалагічных навук
А.С.Ліс (заг. аддзела фалькларыстыкі Дзяржаўнай навуковай установы "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі")

*20504150*

Афіцыйныя апаненты

доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай літаратуры УА "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны" В.С.Новак

кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры тэорыі беларускай літаратуры Беларускага ...іверсітэта В.В.Прыемка

...ы дзяржаўны педагагічны ун...сітэт імя М.Танка"

Абарона адбудзецца 16 лістапада 2006 г. у 11 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 пры Дзяржаўнай навуковай установе "Інстытут мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" (220072, Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2; тэл. 284 18 81)

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ "Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі".

Аўтарэферат разасланы 13 кастрычніка 2006 г.

Выконваючы абавязкі вучонага сакратара
савета па абароне дысертацый
доктар філалагічных навук А.У.Марозаў

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання.** Актуальнасць даследавання сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу абумоўлена яе значным месцам у духоўнай культуры народа, паколькі сімвалы ўвасабляюць каштоўнасці, маральна-этычныя імператывы, светапоглядныя ідэі і пачуцці. Даследаванне вясельнай сімволікі мае вялікае анталагічнае і гнасеалагічнае значэнне ў рэаліях сённяшняга жыцця, накіравана на ўзнаўленне нацыянальнай традыцыі.

Аналіз семіятычнай сістэмы беларускага вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу актуальны для маральна і эстэтычна карэктнай арганізацыі вясельнай дзеі на сучасным этапе. Неабходнасць комплекснага вывучэння знакавай сістэмы беларускага вяселля абумоўлена дзяржаўнай палітыкай, якая ў ліку прыярытэтных кірункаў вылучае падтрымку традыцыйнай культуры, узнаўленне і пераемнасць традыцый і ўключэнне іх у сучасны культурны працэс.

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена яе недастатковай распрацаванасцю ў сучаснай беларускай фалькларыстыцы, што выклікае неабходнасць аналізу сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў, яго вербальнага, акцыянальнага і прадметнага кампанентаў.

Актуальным з'яўляецца таксама сістэмнае даследаванне тэндэнцый эвалюцыі вясельнай сімволікі, што дае магчымасць прасачыць асноўныя кірункі змен ў семантыцы і функцыянальнасці сімвалаў вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу.

**Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтнаму кірунку фундаментальных навуковых даследаванняў “10.3 Гісторыя культуры Беларусі, актуальныя праблемы яе сучаснага стану і перспектывы развіцця: раскрыццё рэгіянальнай і лакальнай разнастайнасці нацыянальнага фальклору, яго унікальнасці ў сферы духоўнай спадчыны народаў Еўропы”. Дысертацыя мае непасрэднае дачыненне да Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў “Даследаванне гісторыі, мастацтва, фальклору, этнакультурных традыцый Беларусі ў кантэксце славянскіх культур, еўрапейскай цывілізацыі, глабальнага развіцця і этнаканфесійных працэсаў у сучасным свеце” (“Гісторыя і культура”) і выканана ў межах задання гэтай праграмы “Беларускі фальклор у агульнаславянскім кантэксце” (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20012251), якое распрацоўвалася Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі ў 2001–2005 гг. Дысертацыйнае даследаванне цесна звязана з Дзяржаўнай комплекснай праграмай навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. “Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры” (“Гісторыя і культура”) і раздзелам гэтай

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



праграмы “Беларускі фальклор: арэальнае і тыпалагічнае, этнакультурная значнасць на сучасным этапе” (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20061107).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэтай дысертацыйнай працы з’яўляецца сістэмны аналіз сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў, вылучэнне асноўных тэндэнцый яе эвалюцыі ў XX – пачатку XXI ст. Мэта даследавання рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач:

1. Ажыццявіць аналіз навуковых падыходаў да даследавання функцыянальна-семіятычнай сістэмы беларускага вяселля.
2. Вызначыць месца і асаблівасці функцыянавання комплексу вясельных страў у семіятычнай сістэме традыцыйнага вяселля, паказаць асаблівасці эвалюцыі сімволікі страў і прадуктаў харчавання ў вызначаны перыяд.
3. Выявіць семіятычны статус пасагу, адзення і яго атрыбутаў у традыцыйным і сучасным вясельным абрадава-паэтычным комплексе.
4. Вызначыць месца і значэнне хрысціянскай сімволікі ў функцыянальна-семіятычнай сістэме вяселля.
5. Разгледзець спецыфіку сімвалаў вады, агню, месяца і сонца ў традыцыйным і сучасным вясельным абрадава-паэтычным комплексе.

**Аб’ект і прадмет даследавання.** Аб’ектам даследавання з’яўляецца вясельны абрадава-паэтычны комплекс беларусаў. Прадмет даследавання складаюць асаблівасці функцыянавання сімволікі традыцыйнага і сучаснага беларускага вяселля.

**Метадалогія і метады праведзенага даследавання.** Даследаванне грунтуецца на тэарэтычных і метадалагічных дасягненнях сусветнай навукі, працах А. ван Генепа, Э.Касірэра, Э.Сэпіра, В.Тэрнера, А.А.Патабні, М.Ф.Сумцова, М.М.Бахціна, У.Я.Пропа, М.І.Талстога, С.Я.Рыбакова, У.П.Анікіна, А.К.Байбурына, Г.А.Барташэвіч, Т.В.Валодзінай, К.П.Кабашнікава, І.В.Казаковай, У.І.Коваля, Т.І.Кухаронак, А.С.Ліса, Л.А.Малаш, А.У.Марозава, А.М.Ненадаўца, В.С.Новак, М.Ф.Піліпенкі, В.В.Прыемка, А.С.Фядосіка, Т.І.Шамякінай, В.М.Шарай і інш.

Метадалагічную аснову даследавання складаюць сістэмны аналіз і комплексны падыход, спалучэнне сінхроннага і дыяхроннага аналізу. У дысертацыйным даследаванні выкарыстаны таксама сацыялагічны метад, метады гісторыка-генетычнага і гісторыка-тыпалагічнага параўнання. У працэсе палявой работы выкарыстоўваліся метады непасрэднага назірання, апытання, інтэрв’ю.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дысертацыя з’яўляецца сістэмным даследаваннем сімвалічных кампанентаў вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў. На падставе палявых фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, якія ахопліваюць усе рэгіёны Беларусі, а таксама даных анкетнага апытання, архіўных і апублікаваных

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



крыніц праведзены семантычны аналіз групаў сімвалаў – частак агульнай сімвалічнай сістэмы беларускага вяселля. Атрыманы матэрыял, спалучэнне ў даследаванні сінхроннага і дыяхроннага аналізу дазволілі прасачыць асноўныя асаблівасці эвалюцыі вясельных сімвалаў у вызначаны перыяд.

Канцэптуалізацыя дысертацыйнага даследавання атрымала сваё афармленне ў наступных палажэннях навуковай навізны:

1. На аснове гістарыяграфічнага аналізу навуковых падыходаў да даследавання сімволікі і функцыянальнасці беларускага вяселля вылучаны асноўныя этапы развіцця навуковай думкі па праблеме.
2. На падставе даследавання рытуалаў і песень, асобных перадвясельных мантычных практык раскрыты полісемантызм і поліфункцыянальнасць вясельных страў. Комплексны аналіз рэалізацыі сімвалаў, асноўных асаблівасцей іх эвалюцыі паказаў, што магічныя функцыі страцілі сваю перавагу (ахова ад шкодных уплываў, выпрабаванне маральна-этычных якасцей маладых і інш.), асобныя традыцыйныя знакавыя стравы зніклі са святочнага стала, іншыя дэсакралізаваліся.
3. Сістэмны аналіз семантыкі вясельнага адзення і шчыльна звязаных з ім пасагу, абмену дарамі дазволіў выявіць асаблівасці функцыянавання сімволікі адзення ў традыцыйным і сучасным вясельным абрадава-паэтычным комплексе (устойлівае захаванне асобных традыцыйных ўяўленняў і абрадавых практык).
4. Упершыню даследаваны месца і значэнне хрысціянскіх сімвалаў у вобразна-семіятычнай сістэме вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў. На падставе аналізу вясельнага абрадавага фальклору паказаны спецыфіка і рэгіянальныя асаблівасці функцыянавання хрысціянскіх сімвалаў у сістэме беларускага вяселля.
5. Сістэмны аналіз сімволікі прыродных стыхій і нябесных свяціл дазволіў вылучыць іх семантычныя кампаненты. Сімвалы вады, агню, месяца і сонца разгледжаны ў якасці аб'ектаў як сінхроннага, так і дыяхроннага аналізу, у выніку чаго выяўлена іх трансфармацыя. Паказана, што знікненне сімволікі нябесных свяціл звязана ў асноўным з памяншэннем ролі вербальнага кампанента (у прыватнасці песень, якія выяўлялі народна-паэтычны паралелізм).

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і вынікі даследавання выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы метадычных рэкамендацый па аднаўленню вясельных традыцый (для ўстаноў культуры Мінскай вобласці), пры складанні зборніка "Фальклорная талака", прысвечанага першаму абласному фестывалю фальклорнага мастацтва "Вяселле" (Нясвіж, 24 чэрвеня 2006). Высновы і матэрыялы дысертацыі могуць быць запатрабаваны пры распрацоўцы лекцыйных курсаў, спецкурсаў ВНУ, скарыстаны ў навуковых працах па фалькларыстыцы; пры распрацоўцы рэкамендацый для рэспубліканскіх, абласных і раённых

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

цэнтраў культуры; у педагагічнай працы, накіраванай на захаванне народных традыцый і светапоглядных універсалій беларускай культуры.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**

1. У выніку правядзення гістарыяграфічнага аналізу навуковых падыходаў да даследавання функцыянальна-семіятычнай сістэмы беларускага вяселля, які ахоплівае другую палову XIX – пачатак XXI стагоддзяў, вызначаны асноўныя этапы развіцця навуковай думкі па праблеме. Аналіз вылучаных этапаў сведчыць аб перавазе знешніх дэтэрмінантаў над унутрысістэмнымі ў вызначэнні супярэчлівага характару развіцця даследаванняў па пытаннях вясельнай сімволікі.

2. Для функцыянальна-семіятычнай сістэмы вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу ўласціва адносная ўстойлівасць, але частка традыцыйных элементаў-сімвалаў пад уплывам новых сацыяльна-культурных умоў жыцця праходзіць інтэнсіўную трансфармацыю: змяняюцца іх функцыі, змест і роля ў жыццёвым цыкле, адзначаецца памяншэнне ролі вербальнага кампанента, асабліва традыцыйных вясельных песень. Змены ў вясельным комплексе неаднолькава закранулі яго асобныя звёны. Выразнымі полісемантызмам і поліфункцыянальнасцю вылучаюцца вясельныя стравы, якія, як і раней, канцэнтруюць у сабе прадуцыравальную сімволіку фертыльнасці, плоднасці, здароўя, шчасця і дабрабыту, асэнсоўваюцца як сімвал збліжэння родаў, маладых, сімвалізуюць пачатак і заканчэнне вяселля. У той жа час на сучасным вяселлі поліфункцыянальнасць абрадавых страў некалькі паслаблена (ахова ад шкодных уплываў, выпрабаванне маральных якасцей маладых і інш.), асобныя традыцыйныя знакавыя стравы зніклі са святочнага стала, іншыя страцілі свой сакральны змест, з’явіліся новыя запазычанні.

3. Якасныя змены адбыліся ў сістэме вясельнага адзення, але ж яго сімвалічны сэнс, асобныя традыцыйныя ўяўленні перайшлі на сучасны касцюм беларусаў (сімвалічныя дзеянні з ручніком, кажухом, галаўным уборам нявесты, букецікамі кветак, абуткам, захаванне нявестай шлюбнага ўбору, найперш вянка і вэлюма, традыцыі падрыхтоўкі пасагу, жартоўных пераапрананняў і інш.).

4. Функцыянаванне хрысціянскіх сімвалаў вызначаецца аднаўленнем асобных традыцый (блаславенне маладых, звяртанне за блаславеннем да Спасіцеля, Багародзіцы і ўсіх святых, вянчанне ў царкве), большай захаванасцю хрысціянскай сімволікі ў заходніх рэгіёнах Беларусі, што абумоўлена гісторыяй іх развіцця.

5. Старажытныя архетыпы, увасобленыя ў сімволіцы нябесных свяціл (сонца, месяц), разам з вербальным суправаджэннем страчваюць на сучасным вяселлі сваю сакральную аснову. З устойлівых элементаў вясельных абрадаў, якія маюць дачыненне да сімволікі вады, агню, месяца і

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



сонца, засталіся абыходжанне вакол стала па сонцу, запальванне саломы і абліванне (крапленне) вадой.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя выканана на падставе палявых экспедыцыйных матэрыялаў аўтара (2001–2006 гг.), якія ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак, сістэматызацыі і аналізу запісаў вясельных фальклорных твораў і абрадавых дзеянняў, якія знаходзяцца ў архівах Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі, абласных цэнтраў народнай творчасці. Упершыню ў айчыннай фалькларыстыцы суіскальнікам праведзена масавае анкетнае апытанне па праблемах функцыянавання сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу (2005). Комплексны аналіз палявых, архіўных, анкетных і апублікаваных крыніц дазволіў паказаць асноўныя кірункі змен у сімвалічнай сістэме беларускага вяселля, функцыянаванне традыцый на сучасным вясковым вяселлі, ступень захаванасці вясельнай традыцыі ў гарадскім асяроддзі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне абмеркавана на сумесным пасяджэнні аддзелаў фалькларыстыкі і славістыкі ІМЭФ імя К.Крапівы НАН Беларусі. Асноўныя вынікі даследавання прайшлі апрабацыю на навуковых канферэнцыях: “Куляшоўскія чытанні” ( Магілёў, 6–7 лютага 2001 г.)”; “Е.Ф. Карский и современное языкознание” (Гродно, 16–17 мая 2002 г.); “Проблемы национальных идентичностей в литературах Старого и Нового света” (Минск, 17–19 сентября 2002 г.); “Социокультурные аспекты межъязыковой коммуникации” (Гродно, 16–17 октября 2002 г.); “Язык и социум” (Минск, 6–7 декабря 2002 г.); ежегодная научная конференция преподавателей и аспирантов Минского государственного лингвистического университета (Минск, МГЛУ, 16–17 апреля 2003 г., 14–15 апреля 2004 г., 21–22 апреля 2005 г., 18–19 апреля 2006 г.); “Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы” (Гомель, 22–23 мая 2003 г.); “Młodzież akademicka a współczesna nauka” (Седльце [Польша]), 22–24 сентября 2003 г.); “Праблемы ўсходнеславянскай этналінгвістыкі” (Мінск, 25–26 красавіка 2003 г.); “Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць” (Брэст, 7–8 кастрычніка 2004 г.); “Открыть миру душу белоруса...” (Гомель, 25–26 октября 2005 г.).

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў 19 публікацыях, сярод якіх 6 артыкулаў у навуковых часопісах, 13 артыкулаў у зборніках матэрыялаў канферэнцый. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў – 97 старонак.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, чатырох раздзелаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц, дадатку. Агульны аб’ём дысертацыі складае 132 старонкі машынапіснага тэксту, з іх

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

104 старонкі займае тэкставая частка дысертацыйнага даследавання, 13 старонак – дадатак, у якім змешчаны вынікі анкетнага апытання (Вяселле (2005): частотны аналіз разглядаемых пераменных з улікам тыпаў населеных пунктаў). Спіс выкарыстаных крыніц налічвае 273 назвы.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **"Уводзінах"** абгрунтаваны выбар тэмы і практычна-анталагічная значнасць даследавання, акрэслена кола праблем, якія патрабуюць навуковага вырашэння, вызначаны кірунак дысертацыйнага даследавання.

**Першая глава "Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы вывучэння вясельнай сімволікі"** прысвечана разгляду пытанняў інстытуцыялізацыі даследавання сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу.

**У першым раздзеле** разглядаюцца агульнатэарэтычныя пытанні сімволікі, а таксама спецыфіка яе даследавання ў дачыненні да вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу. На аснове тэарэтычных напрацовак Э.Касірэра, Э.Сэпіра, В.Тэрнера, К.Г.Юнга, А.А.Патабні, М.М.Бахціна, М.І.Талстога, С.Я.Рыбакова вызначаецца роля сімвала як з'явы культуры. Звяртаецца ўвага на асноўныя тыпы і характарыстыкі сімвалаў, асобнае месца адводзіцца аналізу фальклорных сімвалаў, якія маюць вялікае значэнне ў міжпакаленнай перадачы спадчыны і фарміраванні этнічнай самасвядомасці.

Выяўляецца спецыфіка фалькларыстычных і лінгвістычных падыходаў да вывучэння сімволікі. Лінгвістыка займаецца вывучэннем сімвалічных значэнняў выключна вербальных адзінак, у той час як фалькларыстыка часцей за ўсё разглядае ў якасці сімвалаў сімвалічныя значэнні не толькі моўных адзінак (словаў і словазлучэнняў), але і дзеянняў, і рэчаў. Адзначаецца, што даволі працяглы час у фалькларыстыцы ўвага даследчыкаў канцэнтравалася на вузкіх дэфініцыях сімвала, у значэнні сімволікі вербальных адзінак, што прыводзіла да выключэння з сімволікі мноства яе важных параметраў (як слушна адзначаў У.Проп, "многія вясельныя песні па-за вясельным абрадам не маюць сэнсу, таму вывучаць іх магчыма толькі з улікам абраду, у склад якога яны ўваходзяць")[1].

У метадалагічным плане звернута ўвага на складанасць, шматпланавасць і шматвектарнасць працэсу развіцця вясельнай сімволікі. Разам з эвалюцыяй сімвалічнай сістэмы адбываецца адначасовая трансфармацыя яе асобных звёнаў, больш таго, знікненне асобных сімвалаў альбо іх дэсакралізацыя і адначасова з гэтым узнаўленне асобных традыцыйных сімвалаў і наданне ім новых знакавых якасцей.

---

[1] Пропп В.Я. Сказка. Эпос. Песня. – М.: Лабиринт, 2001. – С. 240.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


**У другім раздзеле** акрэсліваецца кола крыніц па тэме дысертацыі, вызначаецца агульная канцэпцыя і метадалогія, якая дазваляе вырашаць задачы даследавання.

Аналіз навуковай літаратуры ахоплівае вялікі гістарычны перыяд – другую палову XIX – пачатак XXI стагоддзяў і дазваляе вызначыць тры асноўныя этапы развіцця навуковай думкі па пытаннях сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу, якія характарызуюцца колькаснымі і якаснымі асаблівасцямі. У першым этапе (другая палова XIX – пачатак XX ст.) вылучаны два магістральныя напрамкі вывучэння вясельных абрадаў і песень: апісальны і даследчы (аналітычныя працы М.І.Кастамарава, А.А.Патабні, М.Ф.Сумцова, М.В.Доўнар-Запольскага, Я.Ф.Карскага). Другі этап (1920–1980-я гады) вызначаецца практычнай адсутнасцю даследаванняў па пытаннях вясельнай сімволікі, але ў адзначаны перыяд, асабліва ў 1970–1980 гады, праводзяцца франтальныя даследаванні беларускага фальклору, у тым ліку вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу (аб чым сведчаць асобнікі серыі БНТ). Трэці этап (90-я гады XX – пачатак XXI ст.) характарызуецца зваротам да пытанняў сімволікі, семантыкі, міфалогіі, пашырэннем і паглыбленнем даследаванняў па сімволіцы фальклорных твораў. Пытанне аб ролі і семантычным значэнні сімвалічных кампанентаў у вусна-паэтычнай творчасці набывае статус адной з цэнтральных даследчых праблем фалькларыстыкі. У беларускай сучаснай фалькларыстыцы праблемы сімволікі і семантыкі разглядаюцца ў працах Т.В.Валодзінай, А.І.Гурскага, Л.Л.Ермаковай, І.В.Казаковай, У.І.Коваля, І.І.Крука, Т.І.Кухаронак, Л.А.Малаш, І.М.Малашук, І.В.Піваварчык, В.В.Прыемка, А.С.Фядосіка, Т.І.Шамякінай, В.М.Шарай, І.А.Швед, Т.К.Цяпковай і інш.

Тым не менш, нягледзячы на значныя дасягненні і вялікі назапашаны матэрыял, у сучаснай беларускай фалькларыстыцы адсутнічае сістэмнае даследаванне традыцыйнай вясельнай сімволікі і яе эвалюцыі ва ўмовах сацыякультурных змен.

Дысертацыйнае даследаванне грунтуецца на аналізе палявых фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў аўтара, якія збіраліся на працягу 2001–2006 гг. Важнымі крыніцамі даследавання з'яўляюцца архіўныя матэрыялы абласных цэнтраў народнай творчасці і найперш дзяржаўнай установы – Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці. Каштоўныя звесткі па розных аспектах вясельнай сімволікі беларусаў засяроджаны ў архіве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі.

Аўтарам было праведзена шырокае анкетнае даследаванне "Традыцыі ў сучасным вяселлі беларусаў", у якім прынялі ўдзел 825 чалавек. Намі была выкарыстана мэтавая тэрытарыяльная выбарка, арыентаваная пераважна на сельскае насельніцтва (сярод апытаных 547 сельскіх жыхароў), паколькі

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Абавязковым рытуалам беларускага вяселля было блаславенне маладых, значную ролю ў якім выконвалі ікона, свечка, семантыка выяўлення крыжа. У XX ст. у выніку распаўсюджання атэістычных поглядаў роля і месца хрысціянскіх каштоўнасцей, якія атрымалі адбітак у сімвалічнай сістэме беларускага вяселля, значна паменшыліся. Страцілі сваё значэнне сумесныя малітвы маладых, малітвы пры выпечцы каравая. Больш пашыраны малітвы пры прыгатаванні каравая ў Брэсцкай, Гродзенскай, заходніх раёнах Мінскай абласцей. У той жа час матэрыялы нашага даследавання выявілі ўстойлівую папулярнасць народных вясельных абрадаў, якія маюць хрысціянскую аснову [17].

5. Беларускае вяселле характарызавалася багатай сімволікай нябесных свяціл і прыродных стыхій, карані якой знаходзяцца ў глыбокай старажытнасці. Міфалагічныя уяўленні, паводле якіх сонца (жаночы пачатак) і месяц (мужчынскі) увасабляюць ідэальную шлюбную пару, выяўляліся ў сімвалічным параўнанні ў вясельнай паэзіі нявесты з сонцам, а жаніха – з месяцам. Можна канстатававаць, што з памяншэннем ролі песеннай творчасці ў свядомасці сучаснікаў страчваецца пераважная колькасць семантычных кампанентаў сімволікі нябесных свяціл. Апатрапейныя, катартычныя і прадуцыравальныя функцыі выконвалі ў вясельных абрадах беларусаў вада і агонь. У сучасны перыяд з элементаў вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу, якія маюць дачыненне да сімволікі вады, агню, месяца і сонца, засталіся abліванне (крапленне) вадой, запальванне саломы і абыходжанне вакол стала па сонцу. Лімінальная сімволіка вады знаходзіць адлюстраванне ў звычаі пераносіць нявесту на руках праз мост [8].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Артыкулы ў навуковых часопісах


1. Каспяровіч В.В. Семантыка сімвалаў беларускага вяселля // Весці АН Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2003. – № 4. – С. 83–87.
2. Каспяровіч В.В. Тэарэтычныя пытанні сімволікі і функцыянальнасці вясельна-абрадавай паэзіі беларусаў // Вестник МГЛУ. Сер. 1. Филология. – 2004. – № 3 (15). – С. 160–167.
3. Каспяровіч В.В. Сімвалы беларускага вяселля // Роднае слова. – 2005. – № 4. – С. 98–102.
4. Каспяровіч В.В. Сімволіка вясельна-абрадавай паэзіі ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы // Весці Нацыянальнай акад. навук Беларусі: Сер. гуманітар. навук. – 2005. – № 2. – С. 71–77.
5. Каспяровіч В.В. Тэорыя сімвалаў абрадавай паэзіі і класіфікацыя функцый вясельнай сімволікі // Весці Нацыянальнай акад. навук Беларусі: Сер. гуманітар. навук. – 2005. – № 3. – С. 77–82.
6. Каспяровіч В.В. Сімволіка зерня і яго вытворных у вясельна-абрадавай паэзіі беларусаў // Народна творчість та етнографія. – 2005. – № 3. – С. 45–51.


### Матэрыялы навуковых канферэнцый


7. Каспяровіч В.В. Нацыянальна-культурныя асаблівасці беларускага вяселля // Куляшоўскія чытанні: Матэрыялы міжнарод. навук. канф., Магілёў, 6 – 7 лютага 2002 г. – Магілёў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2002. – С. 48–50.
8. Каспяровіч В.В. Семантыка сонца і вады ў вясельных абрадах і песнях // Е.Ф.Карский и современное языкознание: Материалы IX междунар. Карских чт., Гродно, 16 – 17 мая 2002 г.: В 2 ч.– Гродно: ГрГУ, 2003. – Ч. 2. – С. 228–237.
9. Каспяровіч В.В. Сімволіка вяселля ў апісаннях сярэдзіны XIX – пачатку XX стагоддзяў // Проблема национальных идентичностей в литературах Старого и Нового света: Материалы междунар. науч. конф., Минск, 17 – 19 сентября 2002 г. – Минск: ЕГУ, 2002. – С. 33–34.
10. Каспяровіч В.В. Сімволіка вясельна-абрадавай паэзіі беларусаў // Социокультурные аспекты межъязыковой коммуникации: Материалы междунар. науч. конф., Гродно, 16 – 17 октября 2002 г. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 323–328.
11. Каспяровіч В.В. Сімвалічнае значэнне абраду пасада ў беларускім вяселлі // Язык и социум: Материалы V междунар. науч. конф., Минск, 6 – 7 дек. 2002 г.: В 2 ч. – Минск: РИВШ БГУ, 2003. – Ч. 2. – С. 186–190.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



12. Каспяровіч В.В. Сімволіка і семантыка вясельна-абрадавай паэзіі беларусаў // Материалы ежегод. науч. конф. преподавателей и аспирантов ун-та, 16 – 17 апреля 2003 г.: В 4 ч. – Минск: МГЛУ, 2003. – Ч. 4. – С. 88–92.
13. Каспяровіч В.В. Вывучэнне сімволікі вясельна-абрадавай паэзіі беларусаў // Праблемы ўсходнеславянскай этналінгвістыкі: Матэрыялы першай міжнар. навук. канф., Мінск, 25 – 26 красавіка 2003 г. – Мінск: УП "Тэхнапрынт", 2003. – С. 124–127.
14. Каспяровіч В.В. Сімвалы вясельна-абрадавай паэзіі ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы: Материалы III междунар. науч. конф., Гомель, 22 – 23 мая 2003 г. – Гомель, 2003. – С. 187–188.
15. Kasperovich, Olga. Exploring symbols of Belarusian wedding rituals and poetry // Młodzież akademicka a współczesna nauka. – Siedlce: Wydawnictwo Academii Podlaskiej, 2003. – P. 121–124.
16. Каспяровіч В.В. Да пытання семантыкі персанальнага кода беларускага вяселля // Материалы ежегод. науч. конф. преподавателей и аспирантов ун-та, 14 – 15 апреля 2003 г.: В 4 ч. – Минск: МГЛУ, 2005. – Ч. 2. – С. 20–25.
17. Каспяровіч В.В. Роля і семантыка хрысціянскіх сімвалаў у вясельнай абраднасці беларусаў // Канфесіі на Беларусі: гісторыя, сучаснасць: Зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практыч. канф., Брэст, 7 – 8 кастрычніка 2004 г. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2005. – С. 30–34.
18. Каспяровіч В.В. Семантыка і сімволіка элементаў адзення ў вясельна-абрадавай паэзіі беларусаў // Материалы ежегод. науч. конф. преподавателей и аспирантов ун-та, 21 – 22 апреля 2005 г.: В 5 ч. – Минск: МГЛУ, 2005. – Ч. 3. – С. 24–30.
19. Ізотава В.В. Пасаг у беларускім вяселлі: сімволіка і функцыянальнасць // "Открыть миру душу белоруса...": Зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практыч. канф., прысвечанай 150-годдзю з дня нараджэння Е.Р.Раманава, Гомель, 25 – 26 кастрычніка 2005 г. – Гомель, 2005. – С. 117–120.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## РЭЗЮМЕ

**Ізотава Вольга Вітальеўна**

**“Сімволіка вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў”**

**Ключавыя словы:** сімволіка, семантыка, вясельны абрадава-паэтычны комплекс, эвалюцыя, семіятычны статус, функцыянальнасць, вясельнае адзенне, пасаг, хрысціянская сімволіка, сімволіка нябесных свяціл, сімволіка прыродных стыхій.

**Аб’ект даследавання:** вясельны абрадава-паэтычны комплекс беларусаў.

**Прадмет даследавання** складаюць асаблівасці функцыянавання і эвалюцыі сімволікі беларускага вяселля.

**Мэтай дысертацыйнай працы** з’яўляецца сістэмны аналіз сімволікі вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў, вылучэнне асноўных тэндэнцый яе эвалюцыі ў XX – пачатку XXI стагоддзяў.

**Метадалагічнай асновай дысертацыі** з’яўляюцца навуковыя метады даследавання: сістэмны, комплексны, сінхронны, дыяхронны, гісторыка-генетычны, гісторыка-тыпалагічны, а таксама сацыялагічны метады. У працэсе палявой работы выкарыстоўваліся метады непасрэднага назірання, апытання, інтэрв’ю.

**Атрыманыя вынікі і іх навуковая навізна:** На падставе новых тэарэтычных падыходаў і шырокага кола крыніц (палявых, архіўных, апублікаваных крыніц, даных анкетнага апытання) праведзены семантычны аналіз групаў сімвалаў – частак агульнай сімвалічнай сістэмы вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу беларусаў. Атрыманы матэрыял, спалучэнне ў даследаванні сінхроннага і дыяхроннага аналізу дазволілі прасачыць асноўныя асаблівасці эвалюцыі вясельнай сімволікі.

**Галіна выкарыстання:** Фактычны матэрыял і навуковыя палажэнні дысертацыі могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы лекцыйных курсаў па фалькларыстыцы і этналогіі для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў; правядзенні тыпалагічных даследаванняў; пры распрацоўцы рэкамендацый для рэспубліканскіх, абласных і раённых цэнтраў культуры; у педагагічнай працы, накіраванай на захаванне народных традыцый і светапоглядных універсалій беларускай культуры.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


# РЕЗЮМЕ

**Изотова Ольга Витальевна**

**“Символика свадебного обрядово-поэтического комплекса белорусов”**


**Ключевые слова:** символика, семантика, свадебный обрядово-поэтический комплекс, эволюция, семиотический статус, функциональность, свадебная одежда, приданое, христианская символика, символика небесных светил, символика природных стихий.

**Объект исследования:** свадебный обрядово-поэтический комплекс белорусов.

**Предмет исследования** составляют особенности функционирования символики традиционной и современной белорусской свадьбы.

**Целью диссертационного исследования** является системный анализ символики свадебного обрядово-поэтического комплекса белорусов, выявление основных тенденций ее эволюции в XX – начале XXI веков.

**Методологической основой диссертации** являются научные методы исследования: системный, комплексный, синхронный, диахронный, историко-генетический, историко-типологический, а также социологический методы. В процессе полевой работы использовались методы непосредственного наблюдения, опроса, интервью.

**Полученные результаты и их научная новизна:** На основе новых теоретических подходов и широкого круга источников (полевых, архивных, опубликованных источников, данных анкетного исследования) проведен семантический анализ групп символов – частей общей символической системы свадебного обрядово-поэтического комплекса белорусов. Полученный материал, сочетание в исследовании синхронного и диахронного анализа позволили проследить основные особенности эволюции свадебной символики.

**Область использования:** Фактический материал и научные положения диссертации могут быть использованы при проведении типологических исследований; разработке лекционных курсов по фольклористике и этнологии для студентов высших учебных заведений; при разработке рекомендаций для республиканских, областных и районных центров культуры, в педагогической работе, направленной на сохранение народных традиций и мировоззренческих универсалий белорусской культуры.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## ABSTRACT

**Olga Izotova**

### "Symbolism of Belarusian Wedding Rituals in Complex Poetic Forms"

**Key words:** symbolism, semantics, wedding rituals and complex poetic forms, evolution, semiotic status, functionality, wedding costume, dowry, Christian symbolism, symbolic meanings of celestial bodies, the symbolism of nature's elements (water and fire).

**The object of research:** Belarusian wedding rituals and complex poetic forms.

**The subject of research:** functional peculiarities of traditional and contemporary Belarusian wedding symbols.

**The aim of the research:** The research intends to show, through the systemic analysis of complex poetic forms of Belarusian wedding rituals, the main tendencies in the evolution of symbolic meanings that took place in the XXth – early XXIst centuries.

**Methods:** The research carried out systemic and comprehensive analysis of the data. The data were approached from synchronic, diachronic, historico-genetic, historico-typological as well as sociological perspectives. The author has also relied on methods of field research: direct observation, interviewing and polling.

**Results and their scientific novelty:** Recent theories and a wide range of sources (field data, archives, published materials, poll data) enabled the author to describe the symbolic system of Belarusian wedding rituals and their complex poetic forms. The results of the synchronic and diachronic analysis also displayed the evolution outline of wedding symbolism.

**Value:** The research findings can be applied in further typological research; lectures in folklore and ethnology for graduate and post-graduate students; recommendations for republican, regional and local cultural centres; educational practices aimed at preserving ethnic traditions and values.